# ПЕДАГОГ, МЕТАДЫСТ, АСВЕТНІК
## (да 125-годдзя з дня нараджэння Якуба Коласа)

У восеньскія дні 2007 г. Рэспубліка Беларусь ушаноўвае імёны славутых песняроў Якуба Коласа і Янкі Купалы з нагоды 125-годдзя з дня нараджэння.

Усім беларусам вядома імя Якуба Коласа як народнага пісьменніка, але мала хто ведае, што ён быў выдатным настаўнікам, метадыстам, мовазнаўцам, асветнікам. У Я. Коласа настаўнікі пераймаюць народную мудрасць, методыку выкладання, вучацца паважаць народныя традыцыі, любіць родную мову і прафесію Настаўніка.

Я. Колас нарадзіўся 3 лістапада 1882 г. у засценку Акінчыцы былога Мінскага павета ў сям'і лесніка. Сям'я была вялікая і дружная. На развіццё разумовых здольнасцей і таленту будучага паэта вялікае значэнне аказалі дзяцька Антось і маці Ганна Юр'еўна. Дзяцька быў адукаваным чалавекам, добра валодаў словам апавядальніка, любіў гумар, меў прыроджанае педагагічнае пачуццё падыходу да дзяцей і ўменне размаўляць з імі. Менавіта ён навучыў маленькага Кастуся шанаваць кнігі. Ад маці, вельмі добрай, працавітай і мудрай жанчыны, ён упершыню пачуў народныя казкі, паданні, песні.

Адукацыю Якуб Колас атрымаў спачатку ў хатняга настаўніка, “дарэктара”, а потым вучыўся 2 гады ў Мікалаеўшчынскай пачатковай школе, якую скончыў у 1894 г.

У 1898 г. ён паспяхова здае іспыты ў Нясвіжскую настаўніцкую семінарыю. У 1902 г. Якуб Колас атрымоўвае дыплом настаўніка народных вучылішчаў.

Абраная яшчэ ў юнацтве прафесія настаўніка доўгі час была неад'емнай часткай жыцця паэта. Педагагічную дзейнасць Я. Коласа, якая працягвалася з перапынкамі з 1902 па 1929 г., можна ўмоўна падзяліць на два этапы. Першы – дарэвалюцыйны (прыкладна з 1902 г. да пачатку першай сусветнай вайны), другі – савецкі (20-я гг.), калі Якуб Колас жыў і працаваў у Мінску.

Педагагічную дзейнасць Я. Колас распачаў на Палессі ў якасці настаўніка народнага вучылішча ў вёсцы Люсіна, а затым у Пінкавічах. У 1906 г. ён быў пераведзены ў Верхменскае народнае вучылішча Ігуменскага павета. У гэтым годзе 9 – 10 ліпеня ў вёсцы Мікалаеўшчына адбыўся нелегальны з'езд настаўнікаў Мінскай губерніі. Пасля ўсе ўдзельнікі з'езда былі пазбаўлены настаўніцкіх пасад і амаль два гады знаходзіліся пад следствам.

У 1908 г. К.М. Міцкевіч быў асуджаны на 3 гады і да 1911 г. знаходзіўся ў Мінскім астрозе. У 1912 г. ён уладкаваўся настаўнікам у вёсцы Купяцічы, а потым працаваў у Пінскім прыходскім вучылішчы. Тут яго і заспела першая сусветная вайна. На нейкі час ён пакідае Беларусь. З 1915 па 1920 г. ён працуе настаўнікам у Маскоўскай і Курскай губернiях.

У дарэвалюцыйнай педагагічнай дзейнасці Я. Коласа вельмі ярка праявілася ідэя асветніцтва. Як і вялікі рускі педагог К.Дз. Ушынскі, Я. Колас лічыў, што аснову выхавання складае народнасць. Галоўнае месца ў ёй адводзіў роднай мове як стваральніку самога чалавека, народа, яго гісторыі і культуры.

У маладога настаўніка ўсё больш настойліва ўмацоўваліся ідэі аб неабходнасці выхавання ў вучняў свядомых адносін да акаляючай рэчаіснасці і навучання на роднай мове.

Знаходзячыся пад следствам, у 1906 – 1907 гг., Я. Колас арганізаваў у леснічоўцы Смалярня, што каля Стаўбцоў, прыватную нелегальную школу.Гэта была першая на Беларусі школа з навучаннем на роднай мове. У 1908 г. ён быў запрошаны на Магілёўшчыну ў маёнтак пана Гардзялкоўскага ў якасці настаўніка роднай мовы.

Дзейнасць настаўніка Я. Колас разумеў як ажыццяўленне мэты асветы і выхавання падрастаючага пакалення, як сродак збліжэння з народам. Ён шчыра верыў у магутную творчую энергію народа, вёў барацьбу за дэмакратызацыю школы, выступаў у абарону роднай мовы.

У пачатку XX ст. кніжак для дзяцей на роднай мове ў Беларусі амаль не існавала, таму ў 1907 – 1908 гг. Я. Колас пачаў пісаць вучэбную кнігу па беларускай мове для другога года навучання дзяцей у школе. Пецярбургскае выдавецтва “Загляне сонца і ў наша аконца” выпусціла ў 1910 г. у свет кнігу Я. Коласа “Другое чытанне для дзяцей беларусаў”. Гэты вучэбны дапаможнік для дзяцей уражваў разнастайнасцю змешчанага ў ім матэрыялу: тут і байкі, і вершы, і апавяданні, і песні, і народныя казкі, і замалёўкі. Кніга вызначалася мэтанакіраванасцю, мела выхаваўчы характар, дазваляла выклікаць у вучняў цікавасць да з'яў навакольнай рэчаіснасці, знаёміла дзяцей з культурнай спадчынай беларускага народа.

“Другое чытанне” Я. Коласа, як і “Лемантар” К. Каганца, “Першае чытанне для дзяцей беларусаў” Цёткі, – гэта першая спроба падрыхтаваць нацыянальныя падручнікі на роднай мове.

Задачы школы педагог К.М. Міцкевіч бачыў у тым, каб прывіць дзецям любоў да Айчыны, багатай спадчыны свайго народа, да роднай мовы. Як асветнік, Я. Колас стараўся абуджаць у народа пачуццё чалавечай годнасці, заклікаў вучыцца, выступаў за права кожнага беларуса на адукацыю на роднай мове.

Менавіта Я. Колас у пачатку XX ст. праявіў мужнасць і патрыятызм, калі выказваў сваю пазіцыю нязгоды з афіцыйнай і грамадскай думкай наконт роднай

Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.А. Куляшова

мовы. Ён пісаў: "Беларускае слова асуджалася, высмейвалася, выганялася. Са свядомасці народа вытраўлялася сама назва яго краіны. А на таго, хто выступаў са сваім родным словам, глядзелі як на дзівака, над якім можна было толькі пасмяяцца. Такія былі ўмовы жыцця" [3, с. 45].

Даследуючы першы этап педагагічнай дзейнасці Я. Коласа, можна заўважыць, што малады настаўнік не прымае рэакцыйную тэорыю і практыку навучання і выхавання, імкнецца кіравацца прагрэсіўнымі традыцыямі лепшых прадстаўнікоў педагагічнай думкі Расіі і сусвету.

К.М. Міцкевіч пастаянна займаўся павышэннем свайго метадычнага майстэрства: чытаў агульнапедагагічную і метадычную літаратуру, удзельнічаў у дыскусіях з настаўнікамі па праблемах педагогікі або па прачытаным педагагічным артыкуле.

Педагагічныя думкі і асветніцкія погляды Я. Коласа знайшлі прымяненне як у практычнай педагагічнай дзейнасці самога аўтара, так і ў падрыхтаваным ім падручніку для школы, а таксама былі адлюстраваны ў яго дарэвалюцыйных вершах, апавяданнях, паэмах. Напрыклад, у артыкуле "Беларуская мова ў казённай школе" асветнік з болем усклікае: «Не называйце ж беларускай мовы "мёртваю моваю"».

"Як беларуса ні гналі, як яго ні душылі, як ні тапталі яго ў балота, усё ж такі ён захаваў сваю мову" [1, с. 602].

У вершы "Школьная работніца" Я. Колас пераканана сцвярджае, што лепшая доля прыйдзе да беларусаў толькі праз школу: "Ды праз школу непрыкметна прыйдзе шчасця-воля" [2, с. 69].

У вершы "Песня над калыскай" паэт піша аб тым, што невучонаму чалавеку прыйдзецца вельмі цяжка ў жыцці:

"А мо' ў школку пойдзеш ты,
Будзеш чалавекам, –
Без навукі цяжка жыць
Гэтым трудным векам" [2, с. 19].

У паэмах "Сымон-музыка", "Новая зямля", трылогіі "На ростанях", апавяданнях "Дзеравеншчына", "Сірата Юрка" нямала месца народны пясняр адводзіў праблемам выхавання і навучання дзяцей, пытанням становішча сельскага настаўніка, выхавання пачуцця Радзімы, павагі да роднай мовы, выхавання чалавечай годнасці і Асобы вучня.

Другі этап педагагічнай дзейнасці Я. Коласа пачынаецца з 1921 г. Ён прымае актыўны ўдзел у арганізацыі народнай асветы ў Беларусі. У верасні 1922 г. ён пачынае працу выкладчыка методыкі беларускай мовы ў Мінскім педагагічным тэхнікуме. У летнія канікулы 1923 г. Я. Колас чытае на педагагічных курсах у г. Слуцку лекцыі па беларускай мове і методыцы яе выкладання. 28 верасня 1923 г. педагог падае заяву на пасаду асістэнта кафедры беларускай мовы ў БДУ.

Разважаючы аб шляхах выхавання школьнікаў, аб ролі роднай мовы і літаратуры як вядучых вучэбных прадметах у школе, Я. Колас прыходзіць да высновы аб неабходнасці стварэння "Методыкі". У 1926 г. Я. Колас закончыў працу над "Методыкай роднае мовы". Гэта быў вынік яго шматгадовай навукова-педагагічнай працы.

У прадмове да "Методыкі роднай мовы" Я. Колас пісаў: "Наша беларуская школа пераходзіць на выкладанне ў роднай мове і пробуе стаць на свае ўласныя ногі, паяўленне кожнага падручніка для школы, кожнай кнігі для школьнага ўжытку, – адным словам, кожная новая педагагічная літаратура як для вучняў, так і для настаўніка, набывае асаблівае значэнне. Кожны настаўнік беларускай школы вельмі востра адчувае недастачу кніг, падручнікаў і наогул школьнай літара-

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

туры. Гэты брак літаратуры стварае надзвычайныя труднасці для настаўніка і для справы беларусізацыі школ, ставіць вялікія перашкоды для развіцця мовы, бо і настаўніку, і вучням, асабліва сярэдніх і вышэйшых школ, прыходзіцца карыстацца чужымі крыніцамі, што вельмі шкодзіць развіццю свае ўласнае мовы. Вось чаму пытанне аб педагагічнай літаратуры пры такіх умовах стаіць надзвычайна востра".

"Методыка роднай мовы" адрасавана настаўнікам пачатковай школы, але яе матэрыялы могуць быць з поспехам выкарыстаны і выкладчыкамі-мовазнаўцамі ў старэйшых класах і ў вышэйшай школе па курсе "Методыка выкладання роднай мовы". У гэтым яе каштоўнасць. "Методыка" была першым ў Беларусі метадычным дапаможнікам, які даваў настаўнікам навукова абгрунтаваныя прынцыпы навучання роднай мове.

У 1930 г. Я. Колас спыніў выкладчыцкую дзейнасць, але да канца сваіх дзён падтрымліваў цесную сувязь з настаўнікамі, вучнямі, наведваў школы-інтэрнаты. З'яўляючыся віцэ-прэзідэнтам АН БССР, ён працягваў распрацоўваць тэарэтычныя праблемы педагагічнай навукі. У артыкулах "Нашы савецкія дзеці", "Беражыце і любіце сваю родную мову", "Дарожнае будаўніцтва", "Савецкі гуманізм", "Задачы савецкай школы" ён падымае такія актуальныя пытанні, як неабходнасць вывучэння роднай мовы, маральнае і працоўнае выхаванне, метады і сродкі выхавання і навучання, сувязь школы з жыццём.

У сваёй педагагічнай дзейнасці Я. Колас прайшоў шлях ад настаўніка народнага вучылішча да выкладчыка БДУ, акадэміка АН БССР. На працягу ўсяго жыцця Я. Колас адстойваў важнейшыя прынцыпы адукацыі: народнасць, дэмакратызм, гуманізм, права беларускага народа весці навучанне на роднай мове. Вельмі важным лічыў у рабоце настаўніка прывіць вучням уменне самастойна авалодваць ведамі, развіваць пазнавальную цікавасць, творчае мысленне і даследчы розум.

Я. Колас – таленавіты педагог-практык, які ўнёс грунтоўны ўклад у распрацоўку метадычных і тэарэтычных праблем навучання і выхавання.

*ЛІТАРАТУРА*

1. ***Колас, Я.*** Збор твораў: у 12 т. / Я. Колас. – Мн.: Беларусь, 1964. – Т. 11. – 652 с.
2. ***Колас, Я.*** Выбраныя вершы [Уклад. М. Лужанін] / Я. Колас. – Мн.: Маст. літ., 1980. – 240 с.
3. ***Снапкоўская, С.В.*** Ля вытокаў нацыянальнай педагогікі: З гісторыі школы і педагагічнай думкі Беларусі канца XIX – пачатку XX ст. / С.В. Снапкоўская. – Мн.: Нар. асвета, 1995. – 128 с.

*Е.Л. ПЕТУХОВА*

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова